**Ісакаў, А. А.** Час не выкрасліць успаміны… / А. А. Ісакаў; гутарыў Ю. Александровіч // Чырвоны прамень (Чашнікі). — 2003. — 15 лют. — С.2.

## ЧАС НЕ ВЫКРАСЛІЦЬ УСПАМІНЫ…

***Чатырнаццаць, гадоў прайшло з тае пары. Тады, у лютым 1989 года, многім падалося, што нарэшце ўсё скончылася. Неяк раптоўна аддалі загад на вывад савецкага кантынгенту войск з далёкай і ў адначассе такой блізкай для нас краіны пад назвай Афганістан. Тыя архіўныя кадры, калі генерал Барыс Громаў апошнім пакідае «вогненную» зямлю, уразаліся ў памяць многіх. Здавалася, што вайна стала гісторыяй. Але ж тое здавалася. Бо засталіся рэальныя людзі, удзельнікі спрэчнай і безвыніковай вайны. Тады яны былі проста ваенаслужачымі Савецкай Арміі. І не было для іх ніякага іншага слова, акрамя загаду. Яны і сёння жывуць сярод нас. Тыя, каго Радзіма калісьці кінула ў самае пекла…***

***У аддаленай вёсцы Латыголічы жыве Анатоль Аляксандравіч Ісакаў. Жыве як і астатнія: ні горш, ні лепш. Працуе настаўнікам у мясцовай школе. Зараз у ім ужо цяжка разгледзець і былога «афганца». Зрэшты, чаму былога? Афганістан – гэта балючая адмеціна. Яна – на ўсё жыццё...***

**– Анатоль, раскажыце, як вы трапілі на вайну?**

– Як і ўсе, па загаду. Скончыў Аршанскае педвучылішча. Затым адразу прызвалі ў армію. Трапіў служыць у эстонскі горад Тапа, у інжынерныя войскі. Гэта было ў 1987 годзе. Прайшоў «вучэбку». Потым нас пачалі размяркоўваць па злучэннях. Я апынуўся ў інжынерным батальёне горада Баграм, што на тэрыторыі Афганістана.

**– Ці ведалі, куды вас накіравалі?**

– Спачатку ніхто нічога не ведаў. Аб тым, што едзем у раён баявых дзеянняў, даведаліся толькі ва Узбекістане.

**– Было страшна?**

– Дзіўна, але не вельмі. Магчыма, тут сваю ролю адыграла тая савецкая прапаганда, якую ўвесь час убівалі ў нашы вушы. Можа яшчэ што-небудзь. Ва ўсялякім разе я не баяўся. Хаця, канечне, з неафіцыйных крыніц давялося і чуць аб тым, што там робіцца.

**– Як доўга вы прабылі ў Афганістане?**

– Недзе каля трох месяцаў. Потым прыйшоў запыт з Саюза. Былі патрэбны салдаты маёй спецыяльнасці. Мяне перавялі.

**– Што больш за ўсё запомнілася за гэты час?**

– Прыемнага мала. Калі толькі трапілі сюды, то было неймаверна цяжка. Перш за ўсё фізічна. Самі разумееце, што значыць прыехаць з не вельмі цёплай Эстоніі ў сонечны Афганістан. Клімат абсалютна іншы. Але ж да яго прыстасаваліся. Потым усё было па звыкламу будзённа.

**– У чым заключалася ваша служба?**

– Мы – інжынерныя войскі. Таму нашай асноўнай задачай было абслугоўванне дарог. У тым ліку і праверка на міны.

**– Вы былі за лініяй фронту?**

– Не зусім так. Наш батальён меў стратэгічнае значэнне. Ідзе калона, трэба забяспечыць ёй бяспеку. Наогул, там не было лёгкай службы нікому.

**– Прыходзілася губляць саслужыўцаў?**

– Дзякуй Богу, у нас, пакуль я служыў, усе былі цэлыя. Але амаль штодня з розных кропак, дзе вяліся баявыя дзеянні, прыходзілі сумныя весткі. То грузавік з салдатамі падарваўся на фугасе, то калона нарвалася на засаду.

**– Было цяжка пра гэта чуць?**

– Вельмі. Калі сам знаходзішся там, то ўсё здаецца блізкім. Да таго ж узнікала пачуццё адказнасці. Можа мы дзе што не дагледзелі Душманы ваявалі як мае быць...

**– Даводзілася трапляць пад абстрэл?**

– Менавіта па нашай базе не стралялі. Аднак, тое ж вайна. Па начах заўседы было неспакойна. Здавалася часам, што кулі свісцяць дзесьці блізка, нібы ў цябе над галавой.

**– Як да вас ставіліся простыя афгацы?**

– Сярод іх былі розныя людзі. Хтосьці глядзеў на нас як на акупантаў. Для кагосьці мы былі героямі.

**– І ўсё ж, Анатоль, зараз, калі прайшло шмат часу, што вы думаеце пра тую вайну?**

– Разумееце, усё не так проста. Зараз кажуць, што яна была несправядлівай. Хутчэй за ўсё, так яно і ёсць. Але адназначна магу сказаць: ваяваць было немэтазгодна. Чаму мы туды палезлі? Таму, што нашы партыйныя вярхі пажадалі будаваць камунізм у гэтай амаль першабытнай краіне? Спрабавалі зламаць іх родаплемянную сістэму. Нічога не атрымалася. А колькі хлопцаў не вярнулася дадому...

**– Ці адольваюць успаміны?**

– Зрэдку. 15 лютага вып’ю сто грам. Навошта варушыць мінулае.

**– Што думаеце пра цяперашняе жыццё?**

– Яно складанае. А на вёсцы – удвая. Хутка ў школе некага будзе вучыць. Дзяцей усе менш і менш. Ды і адкуль ім брацца. Сёння сяляне ператварыліся ў старцаў. Атрымоўваюць у саўгасе па 10–15 тысяч. І тыя, бывае, прап’юць. Вёска дэградыруе.

**– Ці лёгка быць «афганцам» сёння?**

– Цяжка, бо ты нікому не патрэбен. Ладна я. Але ж ёсць хлопцы, якія былі ў самым пекле. Многія з іх засталіся калекамі. І што зараз? Зараз мне крыўдна глядзець на іх гора. Яны нікому не патрэбны. Раны Афганістана не хутка пройдуць...

**Гутарыў Ю. Александровіч**

*Пастскрыптум*

*У нядзелю 2 лютага у нашага героя нарадзілася другая дачка. Магчыма, сёння для яе бацькі і не самы лепшы дзень, каб прымаць віншаванні. І ўсё ж, паважаны Анатоль Аляксандравіч, мы вас віншуем з такой важнай падзеяй у жыцці. Няхай ваша дачка гадуецца і бачыць толькі самае лепшае. А пра вайну чытае выключна ў падручніках па гісторыі...*